Крыніца: adu.by Нацыянальны інстытут развіцця адукацыі

**Дэма-версія практычнага задання для экзамена па гісторыі Беларусі, для навучэнцаў 9-х класаў (2022/2023 навучальны год). Білет 10. Варыянт 6. Ч.1**

**Білет 10. Практычнае заданне. Вялікая Айчынная вайна ў гістарычнай памяці беларускага народа.**

**Заданні склала:** Зянова Т.В., гімназія № 15 г. Мінска

Выкарыстоўваючы прадстаўленыя матэрыялы, адкажыце на пытанні:

1. Прывядзіце прыклады гераічнай барацьбы ўраджэнцаў Беларусі на франтах Вялікай Айчыннай вайны, удзелу беларусаў у еўрапейскім руху Супраціўлення
2. Ахарактарызуйце ўклад беларускага народа ў Перамогу над нацысцкай Германіяй.
3. Чым, на ваш погляд, тлумачыцца гераічнасць беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны?
4. Як вы разумееце выраз «Подзвігу народа жыць у стагоддзях»?

**Крыніца І**

**Даведачная інфармацыя.** Уклад беларускага народа ў перамогу над нацысцкай Германіяй.

«Тадора Храбрая з Бялыніч адправіла на фронт шасцярых сваіх сыноў, столькі ж сыноў паслаў у Чырвоную Армію быхаўскі калгаснік Акім Красоўскі. Старэйшы з яго сыноў, Сцяпан, які лятаў на штурмавіку, стаў маршалам авіяцыі».

«З сям'і Сцяпана Пляца, жыхара вёскі Азярцы Талачынскага раёна, з ворагам змагаліся 4 сыны і 2 нявесткі. За час вайны на самалётах яны здзейснілі 2640 баявых вылетаў, былі ўзнагароджаны 50 ордэнамі і медалямі, а нявесткі Руфіма і Раіса сталі Героямі Савецкага Саюза».

**Крыніца ІІ**

**Даведачная інфармацыя. Ураджэнцы Беларусі на франтах Вялікай Айчыннай вайны.**

«Мужна змагаліся з ворагам на заснежаных палях Падмаскоўя ўраджэнец Бешанковіцкага раёна генерал-маёр Л. Даватар, гамяльчане браты-палкоўнікі Аляксандр і Пётр Лізюковы, ураджэнец Міншчыны Д. Гліцэвіч. Першы ў гісторыі вышынны паветраны таран здзейсніў у маскоўскім небе беларус А. Катрыч, першы начны паветраны таран – В. Талаліхін».

«Сын селяніна з в. Машканы Сенненскага раёна, лётчык А. Гаравец на Курскай дузе прыняў бой з 20 варожымі бамбардзіроўшчыкамі, збіў 9 самалётаў. Ён адзіны ў свеце лётчык, які ў адным паветраным баі збіў столькі самалётаў».

Крыніца: adu.by Нацыянальны інстытут развіцця адукацыі

«Усяго 446 беларусаў і ўраджэнцаў Беларусі атрымалі званне Героя Савецкага Саюза, чацвёра з іх - П. Галавачоў, І. Гусакоўскі, С. Шутаў, І. Якубоўскі - удастоены гэтага звання двойчы, 67 чалавек сталі кавалерамі ордэна Славы трох ступеняў. Каля 400 тысяч воінаў - беларусаў і ўраджэнцаў Беларусі ўзнагароджаны баявымі ордэнамі і медалямі. За гады вайны каля 400 беларусаў сталі генераламі і адміраламі».

**Крыніца III**

**Даведачная інфармацыя. Ураджэнцы Беларусі ў руху Супраціўлення**

«У руху Супраціву актыўна ўдзельнічалі беларускія жанчыны. У Францыі яны арганізавалі асобны жаночы атрад "Радзіма", які праславіўся баявымі аперацыямі. Камандзірам атрада была абрана мінчанка М. Лісавец».

«На землях Чэхаславакіі дзейнічала брыгада імя Клімента Готвальда, якую ўзначальваў ураджэнец Лепельскага раёна В. Квіцінскі. Толькі ў верасні 1944 года брыгада ажыццявіла 158 баявых аперацый».

Крыніца: adu.by Нацыянальны інстытут развіцця адукацыі

Адказы:

1. На фронт сыходзілі цэлыя сем'і беларусаў, адважна ваявалі не толькі на савецка-германскім фронце, але і ў еўрапейскіх краінах;

Першы ў гісторыі вышынны паветраны таран здзейсніў у маскоўскім небе беларус А. Катрыч;

Першы начны паветраны таран – В. Талаліхін;

Лётчык А. Гаравец на Курскай дузе прыняў бой з 20 варожымі бамбардзіроўшчыкамі, збіў 9 самалётаў. Ён адзіны ў свеце лётчык, які ў адным паветраным баі збіў столькі самалётаў;

Камандзір французскага атрада "Радзіма" М. Лісавец;

2. На франтах Вялікай Айчыннай вайны змагалася больш за 1,3 млн выхадцаў з Беларусі. На акупіраванай тэрыторыі Беларусі гераічна супрацьстаялі ворагу партызаны і падпольшчыкі, жыхары акупаваных тэрыторый і тылу. Нават дзеці імкнуліся аказаць дапамогу ў набліжэнні Перамогі.

3. Гераічнасць беларускага народа ў барацьбе з фашысцкімі захопнікамі тлумачыцца тым, што беларускі народ змагаўся, абараняючы сваю зямлю, якая была захоплена ворагам, яны змагаліся з фашыстамі, якія спальвалі вёскі, арганізоўвалі канцлагеры, забівалі ні ў чым невінаватых жыхароў. На тэрыторыі Беларусі быў устаноўлены рэжым, які прыгнятаў і знішчаў людзей. Усё гэта і выклікала небывалую гераічнасць беларускага народа ў барацьбе з фашысцкай Германіяй.

4. Бываюць падзеі, якія з часам сціраюцца з памяці народнай, становяцца здабыткам архіваў. Але ёсць падзеі, значэнне якіх з гадамі не толькі не памяншаецца, а, наадварот, з кожным новым дзесяцігоддзем набываюць асаблівую значнасць, становяцца несмяротнымі. Да такіх падзей адносіцца перамога нашага народа ў Вялікай Айчыннай вайне.

Высокія духоўна-маральныя каштоўнасці дазволілі выстаяць і перамагчы беларускаму народу ва ўмовах нацысцкай палітыкі генацыду і выпаленай зямлі на часова акупаванай тэрыторыі нашай рэспублікі. І мы не павінны пра гэта забывацца.

(Адказ з'яўляецца арыентыровачным)